Настаўніцкая газета
№ 90 (8952), 26 лістапада 2024 года

Набытыя веды — лесвіца да поспеху

Экзаменацыйная (тэставая) работа па беларускай мове, прапанаваная на цэнтралізаваным экзамене (ЦЭ) у 2024 годзе, адпавядала вучэбным праграмам па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для V–IX класаў, X–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень), па якіх праходзілі навучанне ў адпаведных класах выпускнікі 2024 года, Праграме ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі, 2024 год, зацверджанай загадам міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 10.11.2023 № 500; Спецыфікацыі экзаменацыйнай (тэставай) работы па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» для правядзення цэнтралізаванага экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання ў 2024 годзе, зацверджанай міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 28.11.2023.

У 2024 годзе ЦЭ па беларускай мове з улікам рэзервовых дзён здавалі 11 513 чалавек. Максімальна магчымы тэставы бал (100) атрымалі 177 выпускнікоў, якія навучаліся ва УАСА, што размешчаны ў розных рэгіёнах рэспублікі. Стабальныя рэзультаты размеркаваны па ўсіх варыянтах экзаменацыйнай работы.

Нулявыя рэзультаты адсутнічаюць.

Згрупаваўшы тэставыя заданні па праграмных раздзелах, прывядзём паказчыкі іх выканання выпускнікамі падчас ЦЭ-2024.

Маўленне. Тэкст. Стылістыка

На праверку ўменняў і навыкаў аналізаваць сэнсавую структуру тэкстаў навуковага, мастацкага і публіцыстычнага стыляў было арыентавана заданне В12. Каля 18% удзельнікаў ЦЭ па беларускай мове не змаглі ідэнтыфікаваць тэкст навуковага стылю, 14% – мастацкага стылю. Большасць з тых выпускнікоў (40%), хто памыліўся, не мелі навыку размежавання тэкстаў публіцыстычнага стылю. Такім чынам, статыстычныя паказчыкі падводзяць да высновы, што ў працэсе навучання найбольшы акцэнт трэба рабіць на працы з тэкстамі публіцыстычнага стылю.

У заданні В13 падыспытным было прапанавана з двух выдзеленых слоў выбраць адно, якое з'яўляецца сродкам сувязі сказаў у тэксце. Абсалютная большасць выпускнікоў без асаблівых цяжкасцей вызначыла такі распаўсюджаны ў пісьмовым маўленні сродак сувязі, як займеннік. З заданнем справілася 86,7% удзельнікаў ЦЭ.

Лексікацэнтрычны кантроль ва УАСА прадугледжвае назіранне за лексікай (слоўнікавым запасам) вучняў і ацэнку іх умення пазбягаць маўленчых памылак: недакладнасці словаўжывання, немэтазгоднага «ўкрапвання» размоўных слоў, русізмаў і пад. Для правільнага выканання задання В14 удзельнікам іспытаў неабходна было выключыць з двух прапанаваных слоў выразны русізм і запісаць слова, якое адносіцца да актыўнай лексікі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Больш за 68% выпускнікоў не дапусцілі маўленчых памылак, правільна вызначыўшы русізмы *неабычных*, *паскальзнешся*, *улавімым*, *пазнавацельным*, *безгранічная* ў прыкладах *(неабычных, незвычайных) маршрутаў*, *(паскальзнешся, паслізнешся) на лядку*, *(улавімым, улоўным) подыхам*, *(пазнавальным, пазнавацельным) творам*, *(бязмежная, безгранічная) ніва*.

Фанетыка і арфаэпія

Агульная задача фанетыкі і арфаэпіі заключаецца ў павышэнні культуры вуснага маўлення, у выпрацоўцы правільнасці і майстэрства маўлення. Ступень валодання фанетыка-арфаэпічнымі нормамі літаратурнай мовы правярала заданне адкрытага тыпу В15, у якім трэба было знайсці ў сказе тэксту слова, якое мае 3 мяккія зычныя гукі. Толькі 50% выпускнікоў 2024 года ведалі, у чым прызначэнне літар *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і* ў беларускай мове, і прадэманстравалі добрае валоданне нарматыўным (літаратурным) вымаўленнем. Палова ўдзельнікаў ЦЭ не засвоіла таго, што ў пэўных пазіцыях літары *е*, *ё*, *ю*, *я*, *і* могуць абазначаць два гукі, і не распазнала мяккага гука [й] у словах тыпу *палескія*, *беларускія*, *блізкія* – [па**л'**э́с**к'і́й**а], [**б'**элару́с**к'і́й**а], [б**л'**і́с**к'і́й**а].

Арфаграфія

Раздзел у экзаменацыйнай рабоце быў прадстаўлены матэрыялам 7 заданняў: 3 заданнямі закрытага тыпу і 4 заданнямі адкрытага тыпу.

У групу найбольш складаных для ўсіх удзельнікаў ЦЭ трапіла заданне А4 на праверку ведання тэмы «Правапіс мяккага знака і апострафа» (пры гэтым звяртае на сябе ўвагу яўны якасна розны ўзровень ведаў у тых выпускнікоў, хто закончыў школу, і ў выпускнікоў гімназій і ліцэяў). Характар і працэнт памылак, якія дапусцілі падыспытныя пры выкананні дадзенага задання, наступныя:

– 30% выпускнікоў не засвоілі правіла напісання мяккага знака ў словах накшталт *агеньчык*, *карэньчык*, *каменьчык*, утвораных ад назоўнікаў на *-нь* (*агонь*, *корань*, *камень*);

– 20% удзельнікаў ЦЭ адзначылі, што пасля ў (*нескладовага*) у словах тыпу *салаўіны*, *здароўе*, *выслоўе* пішацца апостраф, а пасля губных зычных у словах тыпу *вераб'іны*, *інтэрв'ю*, *сям'я* – мяккі знак;

– 16% падыспытных памыліліся пры напісанні слоў іншамоўнага паходжання тыпу *фельетон*, *ласьён*, *кампаньён*;

– 8% удзельнікаў экзамену не ведалі, што пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны, перад літарамі *е*, *ё*, *ю*, *я* і націскным *і* ў словах тыпу *з'яднаць*, *пад'есці*, *пад'ёмны* пішацца апостраф.

Дастаткова складаным стала ў бягучым годзе і заданне В2 на праверку засваення тэмы «Правапіс галосных ***е***, ***ё***, ***я***». На прыкладзе задання з варыянта 1 (1-ы варыянт выконвалі 2284 чалавекі) прадэманструем характар памылак і колькасць памылковых адказаў.

Узор задання:

В2. З прапанаваных слоў вызначце тое, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і запішыце яго правільна:

вуглекіслы, *мядовы*, *сеанс*, *мяккаваты*, *бязветраны*.

Адказ: вуглякіслы

Правільна вызначылі слова, якое не адпавядае арфаграфічнай норме, і выправілі памылку 1361 чалавек. Аднак 923 чалавекі ці не знайшлі памылкі, ці не змаглі яе выправіць. З іх:

– 277 чалавек палічылі, што арфаграфічнай норме не адпавядаюць словы *мядовы* і *бязветраны*, у якіх у першым складзе перад націскам пішацца літара *я*, і далі няправільны адказ: *безветраны*, *медовы*;

– 267 чалавек памыліліся, выбраўшы слова *сеанс* як няправільна напісанае, бо не засвоілі таго, што ў словах іншамоўнага паходжання незалежна ад месца націску пішацца літара *е*: *сеáнс*;

– 145 чалавек не ведалі правапісу слова *мяккавáты*, у якім незалежна ад месца націску захоўваецца літара ***я***;

– 46 чалавек не ведалі правапісу не толькі злучальных галосных, але і прыстаўных зычных і далі няправільны адказ: *вуглікіслы*, *углекіслы*.

Звярнуўшыся да рэзультатаў выканання астатніх 5 заданняў па арфаграфіі, адмаркіруем правілы, на якія была дапушчана найбольшая колькасць памылак, і пазначым у дужках працэнт няправільных адказаў:

– А2 – напісанне з вялікай літары прыдаткаў, якія абазначаюць назвы кандытарскіх вырабаў, тыпу *торт «Казка»*, *вафлі «Віцьба»* (9%);

Здымак выкарыстоўваецца ў якасці ілюстрацыі.

Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

– А3 – напісанне у (*складовага*) у словах іншамоўнага паходжання, якія заканчваюцца на *-ум*, *-ус*, тыпу *шлагбаум*, *страус* (9%);

– В1 – напісанне літары *а* ў словах іншамоўнага паходжання, якія маюць фіналь *-ар*, тыпу *світар*, *прынтар* (16%);

– В3 – правапіс спалучэнняў зычных *ск*, *ст*, *сц* [с'ц'] на канцы кораня слоў, якія чаргуюцца з *шч*, тыпу *абла**шч**аны* ← *ла**ск**а*, *гу**шч**ыня* ← *гу**ст**ы*, *пя**шч**отны* ← *пе**сц**іць* (17%);

– В4 – напісанне дзвюх аднолькавых літар на стыку кораня і суфікса ў словах тыпу *гадзіннік*, *маліннік* (18%).

Увогуле, максімальнае разуменне арфаграфічнага матэрыялу, высокую ступень сфарміраванасці адпаведных маўленчых навыкаў падчас ЦЭ-2024 прадэманстравалі 70,33% выпускнікоў бягучага года ўсіх устаноў адукацыі.

Лексіка. Фразеалогія

Слоўнікавае багацце нашай мовы невычарпальнае. Свет слоў, якія з'яўляюцца сведкамі ўсіх змен у нашым жыцці, адлюстроўваючы падзеі, думкі чалавека, звычаі і г. д., багаты і рознабаковы. Гэта прымушае нас вельмі ўважліва і беражліва ставіцца да кожнага слова, не мірыцца з асабістым няведаннем значэння тых ці іншых лексічных адзінак. Наадварот, важна і, несумненна, прэстыжна папаўняць свой слоўнікавы запас, даследаваць гісторыю і этымалогію слоў. Менавіта так мы пазбаўляемся асабістай недасведчанасці, клапоцімся пра выразнасць, дакладнасць, вобразнасць, прыкметнасць і індывідуальнасць маўлення. Акрамя таго, беднасць слоўнікавага запасу і абыякавыя адносіны да яго папаўнення не даюць магчымасці чалавеку пацвердзіць сваё валоданне мовай.

У 2024 годзе выпускнікі маглі прадэманстраваць веданне лексічных рэсурсаў роднай мовы, паспяхова выканаўшы заданне А1. Аднак даволі значная частка ўдзельнікаў ЦЭ (ад 30% да 48%) з заданнем не справілася. Адны з іх памылкова ўказалі, што правільна вызначана лексічнае значэнне слоў, выдзеленых у наступных прыкладах: добры ***лук*** – '*агароднінная расліна*', прыгожая ***рэч*** – '*мова*', смачныя ***сліўкі*** – '*густы і тлусты верхні слой на малаку*', ***неблагі*** дзень – '*нядобры*', хутка ***ўстаць*** – '*стаміцца*'. Іншыя памыліліся, адзначыўшы, што няправільна вызначана лексічнае значэнне слоў, выдзеленых у такіх прыкладах, як: пабудаваць ***сёлета*** – '*у гэтым годзе*', ***ставіцца*** з даверам – '*праяўляць, выражаць свае адносіны да каго-небудзь*', ***марудзіць*** з рамонтам – '*доўга не пачынаць справы*', ***небяспечны*** вецер – '*які прыносіць шкоду*', адносіцца ***ашчадна*** – '*беражліва, эканомна*', ***руплівы*** гаспадар – '*які імкнецца зрабіць як мага больш і лепш*'.

Ступень пранікнення выпускнікамі ў фразеалагічную сістэму беларускай мовы правяралася матэрыялам задання В11. З вялікай доляй упэўненасці можна сказаць, што ўдзельнікі іспытаў, якія не падабралі слоў-кампанентаў да вядомых фразеалагізмаў (напрыклад: *першая скрыпка*, *куды гэта варта*, *браць слова*, *бачыць навылёт*, *абы дзень да вечара*, *аршын з шапкай*), не часта карыстаюцца ў сваёй маўленчай дзейнасці ўстойлівымі выразамі. Акрамя таго, тыя падыспытныя, хто памыліўся (утварылі фразеалагізмы *прыгожая скрыпка, адкуль гэта варта*, *выкрасліць слова*, *браць навылёт*, *хіба дзень да вечара*, *шалік з шапкай*, *шалік над галавой*), нават не задаліся пытаннямі: *якое значэнне маюць утвораныя імі «ўстойлівыя» выразы?*, *у якой маўленчай сітуацыі іх можна выкарыстаць?*

Марфемная будова слова. Словаўтварэнне і арфаграфія

У заданні па марфеміцы ў 2024 годзе патрабавалася ідэнтыфікаваць наступныя словы з нулявым канчаткам: *прыклад*, *прыпынак*, *восень*, *світанак*, *шлях*. Як паказала статыстыка, з заданнем справілася 67% удзельнікаў ЦЭ. Большасць няправільных адказаў тлумачыцца тым, што выпускнікі слаба засвоілі ў працэсе навучання ва УАСА інфінітыў, які, з'яўляючыся нязменнай формай дзеяслова, не мае ні выражанага гукам (літарай), ні нулявога канчатка.

Для словаўтваральнага аналізу падыспытным былі прапанаваны прыслоўі, утвораныя прыставачна-суфіксальным спосабам, прыметнікі, утвораныя суфіксальным спосабам, назоўнікі, утвораныя бяссуфіксным (нульсуфіксальным) спосабам, абрэвіятуры. Найбольшыя цяжкасці ў выпускнікоў выклікаў такі спосаб утварэння слоў, як абрэвіяцыя. Словы-абрэвіятуры накшталт *ветурач*, *педсавет*, *медперсанал*, на думку шматлікіх удзельнікаў ЦЭ, утвораны шляхам асноваскладання.

Для прыкладу возьмем заданне В10 з 1-га варыянта экзаменацыйнай работы.

Узор задання:

В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. Пераправа. **Б.** Дзяржкантроль. **В.** Зверху. **Г.** Дарожны.	**1.** Суфіксальны. **2.** Асноваскладанне. **3.** Абрэвіяцыя. **4.** Бяссуфіксны (нульсуфіксальны). **5.** Прыставачна-суфіксальны.

Адказ: А4Б3В5Г1.

З 2284 тых выпускнікоў, якія пісалі 1-ы варыянт экзаменацыйнай работы, толькі 637 чалавек (27,89%) адказалі правільна.

Разам з тым 670 чалавек далі адказ А4Б2В5Г1. Значыць, 29,33% удзельнікаў іспытаў не ведалі, чым адрозніваецца абрэвіяцыя ад асновасклада́ння.

Значная частка падыспытных (12%) памылкова адзначыла прыставачна-суфіксальны спосаб утварэння назоўніка *пераправа*, прыкладна столькі ж палічылі, што спосаб утварэння гэтага слова – асновасклада́нне. Да бяссуфікснага спосабу ўтварэння аднеслі прыметнік *дарожны* 233 чалавекі (10%). Толькі не зразумела, якую ўтваральную аснову і якія марфемы яны пры гэтым вылучалі.

Пры словаўтваральным аналізе, улічыўшы лексічнае значэнне слоў *пераправа* і *дарожны*, падрыхтаваныя выпускнікі 1) суаднеслі іх з дзеясловам *пераправіць* і назоўнікам *дарога*; 2) вылучылі ўтваральныя асновы *пераправ-* і *дарог-*; 3) вызначылі словаўтваральныя сродкі – нулявы суфікс і суфікс; 4) правільна ўстанавілі спосабы ўтварэння слоў – бяссуфіксны і суфіксальны: *пераправ-Ø-а* ← *пераправ/і/-(ць)*; *дарож-н-ы* ← *дарог-(а)*.

Шматлікія памылкі, дапушчаныя пры выкананні задання па словаўтварэнні, звязаны з адсутнасцю ў падыспытных навыку праводзіць словаўтваральны аналіз з улікам лексічнага значэння слоў, устанаўліваць словаўтваральныя сувязі слоў і разгортваць словаўтваральны ланцужок.

Заданне В10 выявіла значныя разыходжанні ў ступені засваення спосабаў словаўтварэння выпускнікамі 2024 года школ (сярэдні працэнт выканання – 26,71), гімназій (сярэдні працэнт выканання – 46,87), ліцэяў (сярэдні працэнт выканання – 55,36).

Марфалогія і арфаграфія

Раздзел уключаў у бягучым годзе 3 заданні закрытага і 9 заданняў адкрытага тыпу.

Асаблівую ўвагу з 12 тэставых заданняў раздзела «Марфалогія і арфаграфія» звяртаюць на сябе заданні на праверку ведання правіл напісання складаных назоўнікаў разам або праз дэфіс, узроўню засваення правапісу часціцы *не* з рознымі часцінамі мовы і правапісу лічэбнікаў, на праверку ступені сфарміраванасці ўменняў утвараць дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану і вызначаць прыназоўнікі ў маўленні.

Ніжэй больш падрабязна разгледзім памылкі, дапушчаныя ўдзельнікамі ЦЭ падчас выканання абазначаных 5 заданняў.

Заданне А5. Больш за 20% выпускнікоў не засвоілі правіл напісання разам складаных назоўнікаў, утвораных пры дапамозе злучальных галосных (*нафтасховішча*, *працаздольнасць*, *машынабудаванне*), агульных назоўнікаў са скарочанай пачатковай часткай *паў-* (*паўапельсіна*, *паўагурка*, *паўабрыкоса*), правіл напісання праз дэфіс назоўнікаў з аднаслоўным прыдаткам (*касманаўт-дублёр*, *горад-пабрацім*, *карабель-спадарожнік*).

Заданне А7. Больш за 40% выпускнікоў не ўлічылі, што ў прыкладах тыпу ***(не) глыбокае***, *але чыстае возера*, ***(не) вялікія***, *але салодкія яблыкі* супрацьпастаўлення няма, што ў такім выпадку *не-* са словамі трэба пісаць разам, бо ўтвараюцца новыя словы з супрацьлеглым значэннем, якія можна замяніць сінонімамі без *не-* (*неглыбокае – мелкае*, *невялікія – малыя*). Практычна 25% падыспытных памылкова аддзялілі *ні-* ад адмоўных займеннікаў і прыслоўяў (*нічым*, *нішто*, *ніхто*, *нідзе*, *ніяк*), 21% удзельнікаў экзамену няправільна напісалі разам часціцу *не* з кароткімі дзеепрыметнікамі (*звесткі* ***не пададзены***, *грыбы* ***не пасушаны***).

Заданне В5. Практычная важнасць тэмы «Правапіс лічэбнікаў» зразумелая. Кожнаму чалавеку нярэдка даводзіцца запісваць лікі словамі, і поспех у гэтым выпадку залежыць толькі ад наяўнасці дакладных ведаў пра лічэбнік. У заданні В5 перад удзельнікамі ЦЭ стаяла задача з прапанаваных лічэбнікаў вызначыць той, які не адпавядае арфаграфічнай норме, і запісаць яго правільна. Правапіс складаных колькасных лічэбнікаў застаўся па-за ўвагай 46% выпускнікоў.

Заданне В19. Тэма «Дзеепрыметнікі залежнага і незалежнага стану, іх утварэнне і правапіс» не выклікала цяжкасцей у 45% падыспытных.

Аналіз адказаў тых удзельнікаў ЦЭ, хто памыліўся, паказаў, што многія не валодалі самім паняццем *дзеепрыметнік*. Імі былі праігнараваны практычна ўсе характарыстыкі гэтай асобай дзеяслоўнай формы. Так, напрыклад, ад асновы неазначальнай формы дзеяслова *атрымаць* з 2284 выпускнікоў, якія працавалі з 1-м варыянтам экзаменацыйнай работы, 313 утварылі не дзеепрыметнік залежнага стану *атрыманы*, а дзеепрыслоўе *атрымаўшы*, больш за 200 чалавек – дзеясловы ў рознай форме накшталт *атрымаў*, *атрымае*, *атрымлівае*. Заданне В19 паказальнае ў тым плане, што некаторыя падыспытныя не змаглі абсалютна дакладна яго выканаць, бо пры запісе адказу або дапусцілі тую ці іншую арфаграфічную памылку (напрыклад: *атрыманны*), або правільна ўтвораны дзеепрыметнік запісалі не ў той граматычнай форме (напрыклад: *атрыманыя*), якая была зададзена ўмовай задання. У адпаведнасці з умовай задання яго трэба было запісаць у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду (*атрыманы*).

Заданне В20. Аналіз адказаў удзельнікаў ЦЭ сведчыць пра адсутнасць у многіх з іх уменняў размяжоўваць службовыя і самастойныя часціны мовы.

У пацвярджэнне сказанага прывядзём прыклад з 5-га вырыянта экзаменацыйнай работы.

Узор задання:

В20. Вызначце ў ***13-м*** сказе тэксту прыназоўнік і запішыце яго.

(13) *Возьмем прыклад: Бяжыць уздоўж жытнёвага поля дарога майго юнацтва.*

Адказ: уздоўж.

Варыянт выконвалі 2307 чалавек. З іх менш за палову (1119 чалавек) далі правільны адказ – *уздоўж*. Астатнія палічылі, што вытворным прыназоўнікам у сказе з'яўляецца займеннік *майго* (506 чалавек), прыметнік *жытнёвага* (137 чалавек), назоўнік *юнацтва* (122 чалавекі), назоўнік *дарога* (57 чалавек), дзеяслоў *возьмем* (52 чалавекі), назоўнік *поля* (50 чалавек), назоўнік *прыклад* (48 чалавек).

Увогуле, каля 57% выпускнікоў не ідэнтыфікавалі ў сказах наступныя вытворныя прыназоўнікі: *пасярод* (*пасярод балот*), *сярод* (*сярод снегу*), *пасля* (*пасля ўзыходу*), *дзякуючы* (*дзякуючы праекту*), *уздоўж* (*уздоўж поля*).

Сінтаксіс і пунктуацыя

Сінтаксіс у экзаменацыйнай рабоце 2024 года быў прадстаўлены 3 заданнямі: 1 заданнем закрытага тыпу і 2 заданнямі адкрытага.

Найбольшую цяжкасць выклікала заданне А8, у якое былі ўключаны характэрныя менавіта для беларускай мовы сінтаксічныя канструкцыі.

На аснове прыкладу з 2-га варыянта абазначым сінтаксічныя канструкцыі, вядомыя большаму і меншаму ліку ўдзельнікаў ЦЭ ў бягучым годзе. Колькасць адказаў у працэнтных адносінах пазначым насупраць кожнай опцыі.

Узор задання:

А8. Адзначце сінтаксічныя канструкцыі, якія адпавядаюць нормам беларускай літаратурнай мовы:

1) паднесці да дзвярэй (80,81);
2) пайсці ў ягады (65,84);
3) жартаваць з сястрычкі (71,11);
4) чатыры пятых ураджаю (21,67);
5) сонечныя праменні (40,99).

Адказ: 1,2,3.

З прыведзенага прыкладу вынікае: 1) для 34,16% з тых падыспытных, хто выконваў 2-і варыянт (2298 чалавек), аказалася малавядомым тое, што ў словазлучэнні *пайсці ў ягады* (у значэнні '*збіраць ягады*') назоўнік *ягады* пры дзеяслове руху *пайсці* ўжываецца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *у*; 2) больш за 40% выпускнікоў не ведалі, што зборны назоўнік *праменне* мае форму толькі адзіночнага ліку і залежнае ад яго слова (прыметнік) таксама ставіцца ў адзіночным ліку: *сонечнае праменне*; 3) 28,89% удзельнікаў ЦЭ палічылі няправільнай сінтаксічную канструкцыю, у якой дзеяслоў *жартаваць* кіруе назоўнікам у форме творнага склону з прыназоўнікам *з*: *жартаваць з сястрычкі*; 4) каля 20% выпускнікоў пазначылі як няправільную сінтаксічную канструкцыю з прыназоўнікам *да*, характэрную для беларускай мовы: *паднесці да дзвярэй* (у рускай мове – *к*: *поднести к дверям*); 5) больш за 20% падыспытных не засвоілі таго, што калі першая частка дробавага лічэбніка – *чатыры*, то другая частка ўжываецца ў форме назоўнага склону множнага ліку: *чатыры пятыя ўраджаю*.

Цяжкасці, што ўзніклі ў выпускнікоў пры выкананні задання В8, тлумачацца як недастаткова трывалымі тэарэтычнымі ведамі, так і адсутнасцю неабходных уменняў прааналізаваць пэўную сінтаксічную канструкцыю, прымяніць веды на практыцы. Гэта пацвярджае і сярэдні працэнт выканання – 57,85. У заданні В8 удзельнікам іспытаў было прапанавана з пяці слоў (форм слоў) – назоўнік у форме назоўнага склону, тры асабовыя дзеясловы, безасабовы дзеяслоў – выбраць і запісаць тое (тую), што можа выконваць ролю выказніка ў безасабовым сказе. Для гэтага трэба было ўзнавіць у памяці асаблівасці будовы безасабовых сказаў, спосабы выражэння выказніка ў іх і выбраць у якасці адказу безасабовы дзеяслоў.

Больш паспяховымі выпускнікі-2024 былі пры выкананні задання В22, дзе трэба было вызначыць у сказе слова, якое з'яўляецца выказнікам, і запісаць яго. Ідэнтыфікаваць у сказе выказнік, выражаны дзеепрыметнікам, змаглі 77,09% падыспытных, адпаведна ў 22,91% удзельнікаў ЦЭ адсутнічалі ўменне рабіць сінтаксічны аналіз сказа і веданне сінтаксічнай ролі розных часцін мовы.

Матэрыялам 10 заданняў закрытага тыпу правяралася ступень тэарэтычнага асэнсавання сістэмы пунктуацыі, пунктуацыйныя навыкі, звязаныя з уменнем расстаўляць знакі прыпынку розных тыпаў у канкрэтных сінтаксічных канструкцыях.

Назавём памылкі, дапушчаныя большасцю ўдзельнікаў ЦЭ-2024 пры выкананні заданняў на праверку пунктуацыйных ведаў.

Аналіз рэзультатаў выканання задання на праверку ведання правіл пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам паказаў наступнае: абсалютная большасць (56%) удзельнікаў ЦЭ не засвоіла, што паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону, і выказнікам, выражаным усечанай формай дзеяслова, ставіцца працяжнік (*Барсік раптам – шмыг на печ.*); 40% выпускнікоў не ведалі, што пры адваротным парадку слоў працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікам у форме назоўнага склону, не ставіцца (Чароўны *спявак жаваранак*).

Умовы, пры якіх аднародныя члены сказа раздзяляюцца (не раздзяляюцца) коскамі, ведала менш за палову ўдзельнікаў ЦЭ-2024. Амаль 45% падыспытных памылкова паставілі коску паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі адзіночным размеркавальным злучнікам *або*: *Галушкі гатуюць з дранай бульбы* ***або*** *з мукі*; да 37% удзельнікаў ЦЭ не засвоілі правіла, у адпаведнасці з якім коска не ставіцца паміж словамі-кампанентамі фразеалагізма: ***Ні з таго ні з сяго*** *ранак дарогі марозам скаваў*.

Пунктуацыйная сітуацыя, прапанаваная ў заданні А11, патрабавала наяўнасці навыку вызначаць сярод сінтаксічных канструкцый параўнальныя звароты, якія выдзяляюцца коскамі. Іх правільна адмаркіравалі 52% выпускнікоў. Пры гэтым з тых 48% удзельнікаў ЦЭ, хто не справіўся з заданнем, 23% памылкова выдзелілі коскамі выказнікі: *Адным ражком маладзік* ***быццам зачапіўся*** *за ялінку*; 22% памылкова аддзялілі коскай зварот, што мае значэнне 'ў якасці': *Вострaў Эспаньёла вядомы* ***як адзіны ў свеце вострaў***, *дзе гняздзяцца хвалістыя альбатросы*.

Знакі прыпынку ў сказах з адасобленымі членамі правільна расставілі 48% удзельнікаў ЦЭ. Памылкі ж, дапушчаныя пры выкананні задання А12, у асноўным былі абумоўлены парушэннем пунктуацыйных норм у сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі і ў сказах з фразеалагізмамі, у складзе якіх ёсць дзеепрыслоўі: 26% падыспытных не аддзялілі коскай дзеепрыслоўнага звароту ў сказах тыпу ***Вырваўшыся праз расчыненае акно***, *палілася на вячэрнія кварталы музыка раяля*, і амаль столькі ж адасобілі фразеалагізмы, у складзе якіх ёсць дзеепрыслоўі і якія ў адпаведнасці з сінтаксічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы не адасабляюцца: *Каб у школу дзеткі восенню пайшлі, працавалі* ***не пакладаючы рук*** *будаўнікі*.

Эфектыўнымі сродкамі выражэння ў маўленні камунікатыўных адносін з'яўляюцца пабочныя словы. Ступень валодання выпускнікамі катэгорыяй пабочнасці была аб'ектам кантролю ў заданні А13. Да 50% удзельнікаў ЦЭ вызначылі ў сказах пабочныя словы. Больш за 26% падыспытных памылкова назвалі пабочным словам часціцу *нават*, якая ніколі ў такой ролі не выступае і коскамі не выдзяляецца: *Без навукі* ***нават*** *лапця не спляцеш*. Прыкладна столькі ж выпускнікоў не засвоілі, што калі слова аднак стаіць у сярэдзіне простага сказа, граматычна не звязана з іншымі словамі ў сказе і мае ўзмацняльнае значэнне (= ***усё-такі***), то яно з'яўляецца пабочным і выдзяляецца коскамі: *Чалавека,* ***аднак****, корміць праца*.

Засвоіць сістэму складанага сказа без дасканалага вывучэння структуры і семантыкі простага сказа нельга. Шматлікія памылкі пры вызначэнні тыпаў канструкцый, калі выпускнікі не могуць адрозніць просты сказ ад складанага, прыводзяць да памылак пунктуацыйных.

Колькасна-змястоўны аналіз адказаў удзельнікаў ЦЭ на заданне А14 па тэме «Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах» паказаў наступнае: ніякіх цяжкасцей амаль у 90% падыспытных не выклікалі складаназлучаныя сказы, у якіх часткі з'яўляюцца назыўнымі сказамі (*Васільковае поле і рамонкавы луг*). Аднак правіла, што коска паміж часткамі складаназлучанага сказа, звязанымі адзіночным спалучальным злучнікам *і*, не ставіцца, калі яны маюць даданы член сказа, які аднолькава адносіцца да кожнай з частак, ведала толькі 64% выпускнікоў: ***Зноў*** *дрэвы захутаны ў шалікі зялёныя і ў полі рассцелены зялёны дыван*. Столькі ж працэнтаў выпускнікоў правільна не паставілі знака прыпынку паміж часткамі складаназлучанага сказа, якія маюць пытальна-клічную інтанацыю і звязаны адзіночным спалучальным злучнікам *і* (*Як зіхацяць люстэркі нашых чыстых азёр і як пахне жывіцай кожны наш бор!*).

Матэрыялам тэставага задання А15 правяралася ступень валодання пунктуацыйнымі нормамі, якія вызначаны для складаназалежных сказаў. Традыцыйна вялікая колькасць удзельнікаў экзамену (41%) няправільна расставіла знакі прыпынку ў складаназалежных сказах з падпарадкавальнымі злучнікамі *што* і *калі*, якія стаяць побач, пры адсутнасці другой часткі *то* (*дык*) парнага злучніка *калі – то* (*калі – дык*): *Кажуць,* ***што****,* ***калі*** *прызнáеш сваю памылку, напалову яе паправіш*. Пасля злучніка *што* ў такіх сказах ставіцца коска. Паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі спалучальным злучнікам *і*, няправільна паставілі коску 33% удзельнікаў ЦЭ: *У кожнага бываюць хвіліны, калі вяртаешся ў мінулае і калі моцна кранаюць сэрца ўспаміны*.

Фармальны падыход да правядзення сінтаксічнага аналізу сказа і адсутнасць дакладнага ведання правіл пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі бяззлучнікавых складаных сказаў не дазволілі 63% выпускнікоў справіцца з моўным матэрыялам задання А16. Як паказаў аналіз рэзультатаў выканання задання, асноўнай часткай удзельнікаў ЦЭ была памылкова пастаўлена коска на месцы патрэбнага працяжніка паміж часткамі бяззлучнікавага складанага сказа, змест якіх супрацьпастаўляецца або супастаўляецца: *Не салавей спявае – шпак салаўіныя спевы старанна пераймае*.

У аснове памылак, якія былі дапушчаны 74% удзельнікаў ЦЭ пры пастаноўцы знакаў прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак, ляжыць слабае засваенне імі правіл пастаноўкі знакаў прыпынку паміж часткамі, звязанымі бяззлучнікавай сувяззю, паміж часткамі са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі і паміж тымі граматычнымі часткамі, адна з якой падпарадкоўваецца другой.

Дапушчаныя выпускнікамі памылкі пры афармленні простай мовы можна, відаць, растлумачыць не толькі прабеламі ў ведах, але і звычайнай няўважлівасцю. З не самай складанай задачай, а менавіта вызначыць з 5 прапанаваных знакаў прыпынку 2 (двукроп'е і кропку), якіх не хапае ў сказе з простай мовай, не справіліся 42% выпускнікоў.

Паспяхова спраўляюцца з заданнямі на праверку ступені засваення сінтаксічных і пунктуацыйных норм тыя выпускнікі, якія маюць сістэматызаваныя веды па тэорыі, умеюць знаходзіць пэўныя заканамернасці і ўстанаўліваць узаемасувязь паміж сінтаксічнымі канструкцыямі і іх пунктуацыйным афармленнем.

Шаноўныя чытачы! Вы азнаёміліся з артыкулам, у якім пададзены найбольш актуальныя звесткі пра рэзультаты ЦЭ-2024 па беларускай мове з акцэнтам на тыповых памылках выпускнікоў. Спадзяёмся, што для вас дадзены матэрыял будзе ў значнай ступені інфармацыйна-даведачным.

РІКВ жадае поспеху ўсім, хто прыме ўдзел у экзаменах у 2025 годзе!

Матэрыял падрыхтаваны Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.